Кныш, В.В. Жанчыны і медыцынская справа ў другой палове XIX ст. на Беларусі / В.В. Кныш // Працы гістарычнага факультэта : навук. зб. Вып. 1 / рэдкал. : У. К. Коршук (адк. рэд.) [і інш.]. — Мінск : БДУ, 2006. — С. 28–32.

***В. В. КНЫШ***

# ЖАНЧЫНЫ І МЕДЫЦЫНСКАЯ СПРАВА Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XIX ст. НА БЕЛАРУСІ

Другая палова XIX ст. на Беларусі — час нарастаючых змен у эканамічнай, сацыяльнай і культурнай сферах жыцця. Гэта час станаўлення буржуазнага грамадства. Сацыяльна-эканамічныя ўмовы гэтага часу спрыялі актыўнаму ўключэнню жанчын у грамадскую і прафесійную дзейнасць, а таксама назіралася пашырэнне сфер іх працоўнага ўдзелу. Жанчыны актыўна ўцягваліся ў вытворчую дзейнасць, працавалі ў прамысловасці, на транспарце, у сферы гандлю, нярэдка ўключаліся ў палітычную і культурную дзейнасць. Не выключэннем была і медыцынская справа.

Аб прафесійнай занятасці жанчын, якія займаліся ўрачэбнай і санітарнай справай, цікавыя звесткі прадстаўляюць матэрыялы Першага Усерасійскага перапісу насельніцтва 1897 г., якія даюць магчымасць атрымаць дадзеныя аб роднай мове жанчын і размеркаванні іх па ўзросце [4—8]. На жаль, перапіс дае толькі агульныя звесткі па складу жанчын вызначанай групы прафесій і не падзяляе іх на асобныя віды дзейнасці: урач, фельчар, акушэрка, павівальная бабка і дапаможны персанал.

Паводле дадзеных перапісу, на Беларусі (улічана інфармацыя па 35 паветах) урачэбнай і санітарнай дзейнасцю займаліся 992 жанчыны. Найбольшая колькасць супрацоўніц-медыкаў налічвалася ў Мінскай губерні — 323 жанчыны, найменшая колькасць — у беларускіх паветах Віленскай губерні, дзе колькасць дасягала толькі 80 жанчын.

У Мінскай губерні 37 % (119 чал.) жанчын-медыкаў працавалі ў сельскай мясцовасці, адпаведна 63 % (204 чал.) у гарадах; у Гродзенскай — 41 (93 чал.) і 59 % (133 чал.); амаль парытэтныя суадносіны ў Магілёўскай губерні — адпаведна 45 (102 чал.) і 55 % (130 чал.). У Віцебскай губерні



жанчыны, занятыя ўрачэбнай і санітарнай справай у гарадах, перавышалі колькасць сельскіх амаль у 4 разы і складалі 79 % (104 чал.). Адваротнае становішча назіраецца ў Віленскай губерні: сельскія жанчыны-медыкі складаюць 62 % (50 чал.).

Дадзеныя перапісу дазваляюць меркаваць аб нацыянальным складзе жанчын, занятых ва ўрачэбнай і санітарнай справе, адносна іх роднай мовы. Гэты прынцып выяўлення этнічнай прыналежнасці быў агульнапрыняты ў сусветнай практыцы статыстыкаў другой паловы XIX ст. Найбольш было жанчын-медыкаў, якія вызначылі сваёй роднай мовай яўрэйскую — 40,1 % (398 жанчын). Колькасць жанчын з рускай і беларускай роднай мовай складаюць амаль аднолькавыя абсалютныя і адносныя лічбы: 24,6 % (244 жанчыны) і 24 % (238) адпаведна. Нязначны працэнт складалі жанчыны польскай нацыянальнасці — 8,6 %. Такі нізкі паказчык здзіўляе, таму што ўзровень пісьменнасці сярод полек быў даволі высокі — 43 %. Адваротнае становішча назіраецца сярод жанчын-беларусак: працэнт працуючых у медыцынскай сферы даволі высокі, а ўзровень іх пісьменнасці складае толькі 6,7 %.

## РАЗМЕРКАВАННЕ ЖАНЧЫН, ЯКІЯ ЗАЙМАЛІСЯ ЎРАЧЭБНАЙ І САНІТАРНАЙ СПРАВАЙ НА БЕЛАРУСІ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XIX ст., ПАВОДЛЕ ДАДЗЕНЫХ АБ ІХ РОДНАЙ МОВЕ [4—8]

| Губерні | Агульная колькасць | Рускія | | Беларусы | | Палякі | | Яўрэі | | Іншыя | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Абсалютная колькасць | Адносная колькасць (%) | Абсалютная колькасць | Адносная колькасць (%) | Абсалютная колькасць | Адносная колькасць (%) | Абсалютная колькасць | Адносная колькасць (%) | Абсалютная колькасць | Адносная колькасць (%) |
| **Віленская губерня** | 80 | 11 | 13,8 | 22 | 27,5 | 12 | 15 | 35 | 43,7 | — | — |
| па паветах | 50 | 5 | 10 | 14 | 28 | 9 | 18 | 22 | 44 | — | — |
| па гарадах | 30 | 6 | 20 | 8 | 26,7 | 3 | 10 | 13 | 43,3 | — | — |
| **Віцебская губерня** | 131 | 44 | 33,7 | 26 | 19,8 | 3 | 2,3 | 51 | 38,9 | 7 | 5,3 |
| па паветах | 27 | 10 | 37 | 8 | 29,6 | 1 | 3,7 | 8 | 29,7 | — | — |
| па гарадах | 104 | 34 | 32,7 | 18 | 17,4 | 2 | 1,9 | 43 | 41,3 | 7 | 6,7 |
| **Гродзенская губерня** | 226 | 54 | 23,9 | 42 | 18,6 | 37 | 16,4 | 78 | 34,5 | 15 | 6,6 |
| па паветах | 93 | 25 | 26,9 | 25 | 26,9 | 11 | 11,8 | 23 | 24,7 | 9 | 9,7 |



*Заканчэнне табл.*

| Губерні | Агульная колькасць | Рускія | | Беларусы | | Палякі | | Яўрэі | | Іншыя | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Абсалютная колькасць | Адносная колькасць (%) | Абсалютная колькасць | Адносная колькасць (%) | Абсалютная колькасць | Адносная колькасць (%) | Абсалютная колькасць | Адносная колькасць (%) | Абсалютная колькасць | Адносная колькасць (%) |
| па гарадах | 133 | 29 | 21,8 | 17 | 12,8 | 26 | 19,5 | 55 | 41,4 | 6 | 4,5 |
| **Мінская губерня** | 323 | 91 | 28,2 | 60 | 18,6 | 23 | 7,1 | 146 | 45,2 | 3 | 0,9 |
| па паветах | 119 | 22 | 18,5 | 46 | 38,6 | 4 | 3,4 | 46 | 38,7 | 1 | 0,8 |
| па гарадах | 204 | 69 | 33,9 | 14 | 6,9 | 19 | 9,3 | 100 | 49 | 2 | 0,9 |
| **Магілёўская губерня** | 232 | 44 | 18,9 | 88 | 37,9 | 10 | 4,3 | 88 | 38 | 2 | 0,9 |
| па паветах | 102 | 15 | 14,7 | 44 | 43,1 | 6 | 5,9 | 36 | 35,3 | 1 | 1 |
| па гарадах | 130 | 29 | 22,3 | 44 | 33,8 | 4 | 3,1 | 52 | 40 | 1 | 0,8 |
| Усяго па 5 губернях | 992 | 244 | 24,6 | 238 | 24 | 85 | 8,6 | 398 | 40,1 | 27 | 2,7 |
| па 35 паветах | 391 | 77 | 19,7 | 137 | 35 | 31 | 8 | 135 | 34,5 | 11 | 2,8 |
| па гарадах | 601 | 167 | 27,8 | 101 | 16,8 | 54 | 8,9 | 263 | 43,8 | 16 | 2,7 |

Развіццё медыцынскай справы на Беларусі патрабавала кваліфікаванага персаналу. Яшчэ ў канцы 40-х гг. XIX ст. расійскі ўрад паставіў пытанне аб стварэнні спецыяльных адукацыйных установаў для падрыхтоўкі бабак-павітух. У хуткім часе пры Магілёўскай радзільнай установе адчынілася аддзяленне для адукацыі сельскіх павітух. У 60-я гг. XIX ст. былі заснаваны асобныя школы павітух: у Магілёве (1865) і Гродне (1876). Гэтыя навучальныя ўстановы ўнеслі істотны ўклад у падрыхтоўку жаночага медыцынскага персаналу Беларусі. Гродзенская школа падрыхтавала каля 700 бабак-павітух, фельчараў і акушэрак [2, с. 15]. Магілёўская школа павітух з’яўлялася найбуйнейшай і найбольш добра арганізаванай медыцынскай жаночай навучальнай установай у Беларусі. У 1874 г. яна пераўтворана ў цэнтральную школу для Магілёўскай, Мінскай і Віцебскай губерняў. Павялічаны быў тэрмін навучання з 2 да 4 гадоў, пашырыўся

пералік прадметаў, узраслі патрабаванні да ведаў, навучанне набыло практычны характар і праводзілася за казённы ці асабісты кошт. Колькасць вучаніц складала прыкладна 50 пансіянерак і



20 вольнаслухачак [3, с. 1]. Пансіянеркі былі пераважна з сялянскага саслоўя, а вольнаслухачкі — з іншых саслоўяў без адрознення веравызнання. У структуры школы дзейнічалі два падрыхтоўчыя і два спецыяльныя класы. Вучэбны план уключаў не толькі прафесійную, але і добрую падрыхтоўку з агульнаадукацыйных прадметаў. Вялікая ўвага надавалася маральнаму выхаванню навучэнцаў. Існавалі строгія расклад дня і звод правіл, абавязковыя для выканання. У выніку парушэнняў дзяўчынкі выключаліся з ліку навучэнцаў. У вольны час вучаніцы даглядалі цяжарных, жанчын-парадзіх і хворых у радзільным інстытуце, выконваючы амаль усе абавязкі: складалі эпікрызы, вялі гісторыю хваробы і праводзілі ўсе малыя гінекалагічныя аперацыі.

Магілёўская школа павітух выпускала да 20 бабак-павітух штогадова і давала сваім выпускніцам дастаткова высокую для таго часу падрыхтоўку [4, с. 956]. Сферай іх прымянення сталі новыя родадапаможныя ўстановы (дамы і аддзяленні павітух): у Магілёве (1862), Гродне (1876), Бабруйску (1889), Мінску (1895). У 1891 г. у Мінску адчынены першы радзільны прытулак, у 1895 г. — другі. У пачатку 1865 г. па праекту былога акушэра ўрачэбнай управы Н. Мандэльштама быў адчынены радзільны інстытут у Магілёве на 25 ложкаў дзеля жаночага аддзялення губернскай хрысціянскай бальніцы.

Такім чынам, у другой палове XIX ст. на Беларусі пачынаюць адчыняцца спецыялізаваныя медыцынскія ўстановы для жанчын, зараджаецца і развіваецца медыцынская адукацыя, павялічваецца колькасць кваліфікаванага жаночага медперсаналу. Трэба адзначыць, што павелічэнне доступу жанчын да прафесійнай адукацыі, пашырэнне сфер іх занятасці, у тым ліку і ў медыцынскай сферы, сведчылі аб змяненні становішча жанчыны, зацвярджэнні і павышэнні яе значнасці і сацыяльнай ролі ў грамадстве.

## ЛІТАРАТУРА

1. *Дембовецкий, А. С.* Опыт описания Могилевской губернии в историческом, физико-географическом, этнографическом, промышленном, сельскохозяйственном, лесном, учебном, медицинском и статистических отношениях: в 3 кн. Кн. 2 / А. С. Дембовецкий. Могилев-на-Днепре, 1882—1884 гг.
2. Здравоохранение Белоруссии в составе Российской империи (1795—1914): метод. разраб. для студентов мед. вузов / Гродненский государственный медицинский институт; сост. Е. М. Тищенко. Гродно, 1999.
3. Отчет по Могилевской центральной повивальной школе (1901 г.) / сост. С. Липинский. Могилев-на-Днепре, 1902.
4. Первая Всеобщая перепись населения Российской империи 1897 г. Спб., 1903. Вып. IV. Виленская губерния. Табл. XV, XX, XXI.



5. Первая Всеобщая перепись населения Российской империи 1897 г. Спб., 1904. Вып. V. Витебская губерния. Табл. XV, XX, XXI.
6. Первая Всеобщая перепiсь населенiя Россiйской імперiи 1897 г. Спб., 1903. Вып. XI. Гродненская губерния. Табл. XV, XX, XXI.
7. Первая Всеобщая перепись населения Российской империи 1897 г. Спб., 1905. Вып. XXII. Минская губерния. Табл. XV, XX, XXI.
8. Первая Всеобщая перепись населения Российской империи 1897 г. Спб., 1903. Вып. XXIII. Могилевская губерния. Табл. XV, XX, XXI.
9. *Хасбулатова, О. А.* Самозащита и самопомощь как средство вовлечения женщин в сферу профессионального труда / О. А. Хасбулатова // Опыт и традиции женского движения в России (1860—1917). Иваново, 1994.